Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка
аддзел бібліятэчнага маркетынгу

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за люты 2015

## Мерапрыемствы да Тыдня роднай мовы

**12 лютага**

Гадзіна паэзіі "Шчаслівай зоркі самародак!" да 80-годдзя з дня нараджэння Р. Барадуліна арганізавана для вучняў 10-11 класаў. Для слухачоў аформлена кніжная выстава і падрыхтаваны агляд творчасці паэта, які суправаджаўся відэапрэзентацыяй.

*Хідрынская СБ, 18 чал.*

**15 лютага**

Літаратурна-музычная гадзіна па ваеннай прозе І. Навуменкі "Аб чым шумелі сосны"да 90-годдзя з дня нараджэння народнага пісьменніка. Да ўвагі прысутных прапанаваны агляд твораў аўтара, яго жыццёвы шлях. Гучалі вершы А. Вярцінскага, Я. Купалы, М. Танка і інш.

*Шамятоўская СБ, 23 чал.*

**21 лютага**

Літаратурна-музычная гадзіна "Роднай мовы пералівы". Прысутным прапанавана кніжная выстава "У спадчыну – добрае, роднае слова", відэаролік, прысвечаны міжнароднаму Дню роднай мовы і віктарына аб гістарычных асобах Беларусі. Гучалі песні і вершы пра Радзіму.

*Арэхаўская СБ, 20 чал.*

**23 лютага**

Прайшла гадзіна роднай мовы "Далучыся да роднага слова". У мерапрыемстве прынялі ўдзел вучні Лелікаўскай школы, якія чыталі вершы беларускіх пісьменнікаў, адгадвалі загадкі, адказвалі на пытанні віктарыны "Беларусь - мая радзіма", ўдзельнічалі ў конкурсах. Пераможцы атрымалі падарункі. Для прысутных падрыхтавана кніжная выстава"Добрым кнігам-добры дзень".

*Лелікаўская СБ, 10 чал.*

**23 лютага**

Ў актавай зале СШ №9 прайшло выступленне ЛПГ "Рытм" "Родная мова – крыніца празрыстая", якое суправаджалася відэапрэзентацыяй. Гучалі вершы беларускіх паэтаў, у тым ліку свае вершы прачытала сябра Міжнароднага саюза пісьменнікаў "Новый современник", карэспандэнт Кобрынскага тэлебачання і газеты "Кобрын-інформ" Наталля Кандрашук. Старшакласнікі актыўна ўдзельнічалі ў адгадванні загадак, чыталі свае любімыя вершаваныя творы. Закончылася сустрэча песняй "Беларусь" у выкананні вядучай Ліліі Туруцько.

*ЦБ, 70 чал.*

**25 лютага**

Літаратурна-паэтычная вечарына "Роднай мовы словы непаўторныя" прайшла ў чытальнай зале цэнтральнай бібліятэкі. Яе ўдзельнікамі сталі навучэнцы Кобрынскага дзяржаўнага палітэхнічнага каледжа. Гучалі вершы беларускіх паэтаў П. Панчанкі, П. Макаля, У. Дубоўкі, М. Танка, А Пысіна. У вечары прыняла ўдзел Наталля Кандрашук. Прагучалі беларускія песні ў выкананні Ліліі Туруцько.

*ЦБ, 25 чал.*

## Мерапрыемтсвы да Дня абаронцаў Айчыны и Узброеных сил РБ і Дня памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў

Дзівінская СБ сумесна з Дзівінскім СДК правялі тэматычны вечар да Дня памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў «Ёсць у памяці імгненні вайны». Для прысутных падрыхтавана выстава "Афганістан - наша памяць і боль», на якой прадстаўлены альбомы, фотаздымкі, газетныя і часопісныя артыкулы; гучалі музычныя кампазіцыі ў выкананні работнікаў СДК і чытачоў бібліятэкі. Старшыня сельвыканкама Разанко А.М. выступіў з віншавальнай прамовай і ўручыў памятныя падарункі ветэранам ваенных дзеянняў у Афганістане.

*Дзівінская СБ, 10 чал.*

**19 лютага**

Вечар памяці “Спякотнымі дарогамі Афганістана”, да якога падрыхтавана кніжная выстава “Эхо Афганской войны”. На працягу вечара гучалі вершы і песні на ваенную тэму, а ў канцы прадстаўлены дакументальны фільм “Война от первого лица. Афганистан”.

*Іменінская СБ, 15 чал.*

**22 лютага**

Адбылася акцыя “Согреем сердца ветеранов”. Дзіцячая брыгада міласэрнасці наведала ветэранаў ВАВ і воінаў-інтэрнацыяналістаў на даму і павіншавала со святам.

*Тэвельская СБ, 6 чал.*

## <u>Іншыя мерапрыемствы</u>

**2 лютага**

Урок-гульня "Неразлучные друзья" прайшоў для вучняў 1 класа. Для першакласнікаў прапанаваны мультфільм пра сяброўства, праведзены конкурс малюнкаў “Ты – мой друг, и я - твой друг”. Усе маленькія чытачы узнагароджаны дыпломамі за ўдзел у уроку-гульні.

*Навасёлкаўская СБ, 8 чал.*

**12 лютага**

Гульня-падарожжа “Я хочу дружить с природой”. Каманды “Капельки” і “Звездочки”, на якія падзяліліся удзельнікі, спаборнічалі ў розных конкурсах, звязаных з жыццём птушак, звяроў, раслін. Дзеці чыталі вершы, малявалі, разгадвалі рэбусы і загадкі. У ходзе мерапрыемства паказаны відэаролікі “Соседи животные”, “Правила поведения на природе”.

*Арэхаўская СБ, 20 чал.*

**13-14 лютага**

У Кобрынская дзіцячай бібліятэцы стартавала акцыя для дзяцей і падлеткаў пад дэвізам "Есть память, которой не будет забвенья, и слава, которой не будет конца". У рамках акцыі для вучняў 3а, 3б, 4а, 4б - СШ №1 прайшлі патрыятычныя ўрокі "Помним войну, помним героев"( пионеры –герои Беларуси в годы Великой Отечественной войны).

*ДБ, 40 чал*

**20 лютага**

Напярэдадні Дня праваслаўнай кнігі Гарадзецкая СБ правяла круглы стол " Зерна света и добра", прысвечаны ролі праваслаўнай літаратуры ў жыцці моладзі. У праграме мерапрыемства адбылася гутарка з настаяцелем Свята-Узнясенскай царквы в. Гарадзец іерэем Георгіем на тэму «Выхаванне моладзі ў духу праваслаўя і патрыятызму», у ходзе якой настаяцель пазнаёміў прысутных з гісторыяй Гарадзецкага прыходу, паказаў старадаўнія богаслужэбныя кнігі, адказаў на пытанні маладых людзей. Гарадзецкай бібліятэкай арганізавана выстава рэпрадукцый ікон “Дающие свет”, якую суправаджала відэа-прэзентацыя « Чудотворные и исцеляющие иконы» і відэа-агляд праваслаўнай літаратуры з фонду Гарадзецкай СБ " Зерна света и добра".

*Гарадзецкая СБ, 20 чал.*

**23 лютага**

“Всех на Масленицу ждем, встретим масленым блином”. Пад такой назвай, прайшло чарговае пасяджэнне актывістаў аматарскага клуба бібліятэкі "Золотые годы”. Ўсіх у гэты дзень сустракаў упрыгожаны стол, на якім быў галоўны атрыбут свята - бліны. Вядучыя свята расказалі аб масленічных традыцыях і сімвалах. Удзельнікі вечара спявалі, **танчылі,** глядзелі святочную відэапрэзентацыю, вялі шчырыя гутаркі.

*ЦБ, 25 чал.*

## Выдавецкая дзейнасць

Аддзелам бібліятэчнага макетынгу падрыхтавана віртуальная кніжная выстава “Беларускія творы святкуюць юбілей”.

*ЦБ*

Аддзелам бібліятэчнага маркетынгу выдадзены зборнік сцэнарыяў мерапрыемстваў, якія правадзіліся сельскімі філіяламі ЦБС у рамках бібліяэстафеты “Чытаючыя вёскі”.

*ЦБ*

Супрацоўнікамі аддзела бібліятэчнага маркетынгу падрыхтаваны фотаальбом “Творческий портрет коллектива  ЦБС”.

*ЦБ*

Аддзелам бібліятэчнага маркетынгу падрыхтаваны электронны фотаальбом "Шестнадцать - в одном. Библиотеки агрогородков Кобринщины."

*ЦБ*

Аддзелам бібліятэчнага маркетынгу падрыхтаваны метадычныя рэкамендацыі бібліятэкам у дапамогу арганізацыі работы з моладдзю "Бібліятэка для моладзі, моладзь у бібліятэцы".

*ЦБ*

Аддзелам бібліятэчнага маркетынгу падрыхтавана памятка "Кожны беларус павінен ведаць ...". Яна дапаможа як у правядзенні масавых мерапрыемстваў, так і ў пазнавальных мэтах.

*ЦБ*

Аддзелам бібліятэчнага маркетынгу падрыхтавана электронная прэзентацыя «Бібліятэка для моладзі, моладзь у бібліятэцы» у дапамогу рабоце сельскіх бібліятэк у Год моладзі.

*ЦБ*

Бібліёграфамі выдадзены бягучы бібліяграфічны паказальнік “Новая літаратура аб Кобрыне і Кобрынскім раёне за 2014 год”.

*ЦБ*